

# АЛЯКСАНДР МЯСНІКЯНЦ (1886—1925):

## *Старшыня Аблвыкамзаха*

Сярод партыйна-бальшавіцкай «большасці» ўжо на пачатку XX стагоддзя ён быў ці не самым перспектыўным... Па-першае (і, вядома ж, самае галоўнае) — бліскучая адукацыя; а (гэта ўжо па-другое) з асабістых якасцей і «прывілей», як сведчылі сучаснікі, — яго вызначалі адданасць справе, вера (як засведчыць потым той жа барометр час — сляпая) у самыя што ні ёсць завоблачныя ідэі, «думкі» і «памкненні»... Хаця, уласна кажучы, тую веру «сляпой» мы назавём потым, падчас, так бы мовіць, разборак; тады ж яна — і ў гэтым няма аніякага чалавечага ганьбавання, ужываючы бальшавіцкую тэрміналогію — «цкавання» — была калі не святой, дык безапеляцыйнай — адназначна.

Але гэта ўжо здагадкі і меркаванні...

Аляксандр Мяснікянц (партыйныя і літаратурныя псеўданімы і мянушкі яго — Мяснікоў, Мартуні, Бальшавік і іншыя) нарадзіўся 9 лютага 1886 года ў горадзе Растоў-на-Доне. У 25-гадовым узросце скончыў Маскоўскі універсітэт, дзе, несумненна, атрымаў бліскучую для таго часу адукацыю. Балазе, быў ужо і сярод актывістаў, хіба што толькі не «з тым ухілам»: яшчэ ў 1904-м Аляксандр прымаў удзел у рэвалюцыйным руху, а ў 1906-м уступіў у Расійскую сацыял-дэмакратычную рабочую партыю...

З пачаткам першай сусветнай вайны Мяснікянц быў мабілізаваны ў царскую армію. Служыў на Заходнім фронце, дзе ўпершыню ўбачыў сапраўдныя рэкі крыві, спазнаў горыч і бяспраўе звычайнага, «смяротнага», чалавека і салдата: самага са-

праўднага «гарматнага мяса»... Аднак бесчалавечнасць насілля над іншым чалавекам, яго Асобай, на маю думку, так і не прымусіла Аляксандра Фёдаравіча ўжо пазней, падчас уваходжання ў самыя высокія эшалоны дзяржаўнай улады, хоць бы на момант над чым-небудзь задумацца, спыніцца, паразважаць...

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента*
*можна азнаёміцца ў будынку*
*бібліятэкі*